ДАСЛОЎНА

# І ДАПАМАГАЦЬ, І ПАТРАБАВАЦЬ

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч — пра...**



### ...уцягванне ў гаспадарчы абарот камунальнай уласнасці

*«У 2016-м планы па ўключэнні ў абарот камунальнай уласнасці выкананы ўсяго толькі на 65%. З 1115 аб'ектаў 723 былі ўцягнуты ў эканамічную дзейнасць. Пры гэтым Гродзенская вобласць спрацавала лепш за іншыя: выйшлі амаль на 100%. У той жа час Віцебская — 47%. Горш за ўсіх Мінск — 32%. А Савет дэпутатаў павінен у першую чаргу гэтым займацца, таму што пытанне зямлі — гэта кампетэнцыя адпаведнага Савета».*

### ...навуку

*«Мы нядаўна з Уладзімірам Краўцовым (старшыня Гродзенскага аблвыканкама. — **Аўт.**) наведвалі Гродзенскі занальны інстытут раслінаводства НАН Беларусі. Гэта досыць паспяховая навуковая арганізацыя, якая працуе па прыкладной тэматыцы. Яго дзейнасць дастаткова эфектыўная — толькі 11% сродкаў ён бярэ з бюджэту, астатнія — зарабляе. Значыць, яго НДДКР (навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія работы. — **Аўт.**), селекцыйныя матэрыялы запатрабаваныя. А што ў іншых галінах? Паспяховыя тыя, хто ўкладвае ў перспектыўныя распрацоўкі.».*

### ...узаемадзеянне органаў мясцовага кіравання і самакіравання

*«У цяперашні час склалася такая практыка, калі Саветы дэлегуюць свае паўнамоцтвы выканкамам. Наша заканадаўства гэта не забараняе, але Саветы дэпутатаў не павінны так працаваць. Возьмем бюджэтнае планаванне. Гэта ж выключная кампетэнцыя Савета, і ў нашым заканадаўстве замацаваны стабільныя крыніцы даходаў. Практыка паказвае, што Саветы фармальна падыходзяць да разгляду бюджэтаў і фактычна галасуюць за тое, што распрацавалі адпаведныя выканкамы. Я не заклікаю да канфрантацыі або перацягвання коўдры. Было б што дзяліць у гэтым бюджэце. Але разам з тым трэба глядзець, на якія мэты накіроўваюцца адпаведныя бюджэтныя сродкі і, можа быць, дзесьці больш акумуляваць сродкі для таго, каб яны давалі аддачу».*

### ...бюракратыю

*«Мы ў Савеце Рэспублікі распрацавалі адпаведны падыход: пры паспяховым выкананні заданняў пяцігодкі трэба прыняць каля 120 нарматыўна-прававых актаў. Гэта не толькі законы, але і ўказы, дэкрэты Прэзідэнта, распараджэнні ўрада для таго, каб прыбраць бюракратызм, які прысутнічае ў многіх, на жаль, кірунках дзейнасці. Гэта датычыцца не толькі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва або прыватнага бізнесу, вельмі шмат яшчэ непаваротлівасці ў рабоце дзяржаўных прадпрыемстваў. Трэба дапамагаць, але трэба і патрабаваць. У нас на кожным прадпрыемстве, у кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі ёсць дэпутацкія групы, і неабходна, каб сесіі гарадскіх і раённых Саветаў разглядалі прынцыпова гэтую работу. Хоць на паперы ўсё як бы добра, фармалізму тут дастаткова».*

### ...экспарт

*«Мы кажам, што ў нас экспартаарыентаваная эканоміка. Гэта правільна, але ў сусветным экспарце доля Рэспублікі Беларусь — 0,18%. Ды і доля Еўразійскага эканамічнага саюза ўсяго толькі 2,9%. Мы яшчэ вельмі слабенькія экспарцёры, мы не ўмеем працаваць на знешніх рынках. На гэтым, вядома, адбіваецца тое, што ў нас была калісьці закрытая самадастатковая эканоміка. Але сёння вага знешняга гандлю цягне за сабой у тым ліку стабільнасць абменнага курсу нацыянальнай валюты. Не будзе экспартнай выручкі — не будзе ўстойлівай нацыянальнай валюты».*

### ...Саюзную дзяржаву

*«Савету Рэспублікі і Савету Федэрацыі, органам прадстаўнічай улады Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі неабходна скаардынаваць работу па гарманізацыі заканадаўства і паглыбленні інтэграцыйных працэсаў. Але мы павінны быць аб'ектыўнымі. Нягледзячы на 25-гадовыя інтэграцыйныя працэсы, у саюзным будаўніцтве, на жаль, так і не дасягнута галоўная мэта — стварэнне роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання нашых краін і для грамадзян Беларусі і Расіі. Часам і ў расійскіх СМІ, і з вуснаў палітыкаў Расіі даводзіцца чуць папрокі ў адрас беларусаў, што мы ўвесь час просім нейкія прэферэнцыі. Гэта зусім не так. Мы паслядоўна, аргументавана настойваем на роўных умовах для прадпрыемстваў і грамадзян на адзінай беларуска-расійскай прасторы».*

# ПАЦЯПЛЕННЕ ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА КЛІМАТУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Старшыня Бярозаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Валерый Яводзік у сваю чаргу звярнуў увагу на тое, што рашэннем гарвыканкама ўся тэрыторыя горада замацаваная за арганізацыямі, у тым ліку за шклозаводам «Нёман». Гэта азначае, што яны адказваюць за навядзенне парадку на пэўнай, напрыклад, вуліцы. Прыкладна два разы на год супрацоўнікі на сваёй тэрыторыі праводзяць месячнікі, а на працягу года даглядаюць яе, падтрымліваюць чысціню.

Пасля Бярозаўкі члены Савета накіраваліся на Лідскі ветэрынарна-санітарны ўтылізацыйны завод. Там яны паглядзелі, як арганізаваны замкнёны ланцужок вытворчасцяў. Прадпрыемствы накшталт гэтага існуюць у Літве і Латвіі. З Літвы і прыйшла кампанія «Марыямпалес АРВІ», якая вырашыла, што Беларусі патрэбен свой завод. Ён, дарэчы, прыцягнуў 23 млн рублёў інвестыцый у раён. Унікальнае прадпрыемства ажыццяўляе збор і перапрацоўку прадуктаў жывёльнага паходжання. Нават калі жывёла памерла ад нейкай хваробы, на вытворчасці змогуць яе бяспечна ўтылізаваць. У выніку атрымліваюць два прадукты: мяса-касцявую муку (зараз ідуць перамовы, каб пашырыць яе экспарт і прадаваць у Бангладэш і В'етнам) і тэхнічны тлушч, які ў Еўрасаюзе выкарыстоўваюць для вырабу біяпаліва. У хуткім часе запрацуе другая лінія, што дасць магчымасць павялічыць аб'ёмы вытворчасці ў 1,9 раза.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Мінойтаўскі рамонтны завод павялічыў экспарт да 57%.**

Іншае прадпрыемства, якое пабудавала гэтая ж літоўская кампанія, — «Арвібелагра». На ім вырошчваюць індыкоў. Дарэчы, у нашай краіне ў сярэднім ужываюць 200 грамаў мяса індычкі на душу насельніцтва, у той час, як у Еўропе гэты паказчык — 4 кілаграмы. Лічыцца, што гэта мяса больш карыснае, бо амаль не мае халестэрыну. На прадпрыемстве расказалі, што адзін з дырэктараў школ алімпійскага рэзерву ўжо заказаў партыю прадукцыі для сваіх спартсменаў.

## Памятаць пра галоўнае

Дырэктар Мінойтаўскага рамонтнага завода ўпэўнены, што для яго прадукцыі канкурэнтаў няма. Прадпрыемства з кожным годам павялічвае экспарт: калі ў 2015-м ён складаў 39%, то ў 2016-м ужо 57%. На гэтым выніку адбіліся і пастаўкі ва Украіну, якія былі адноўлены. Дарэчы, аб'ёмы вытворчасці за мінулы год выраслі на 16%.

Прыкладам, як зрабіць завод больш эканомным, стаў «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» — прадпрыемства, якое вырабляе пластыкавую тару для бытавой хіміі, касметыкі і прадуктаў харчавання. Зараз яно пачынае рэалізоўваць новы праект па вытворчасці ПЭТ-бутэлек — празрыстай тары высокай якасці для касметыкі і бытавой хіміі. На заводзе стаіць спецыяльная ўстаноўка, якая дазваляе эканоміць электраэнергію, а таксама ўсталявана сістэма рэкумерацыі — яна бярэ цеплыню ад машын і перадае ў батарэі.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч расказаў, чым яшчэ цікавіліся

# ПАРТНЁРАЎ

**Летась некаторыя з прадпрыемстваў Лідскага раёна выйшлі на рынкі новых краін, такіх, як Бангладэш, М'янма, Балгарыя, Гвінея і іншыя... Пра тое, з якімі вынікамі Лідчына падышла да новага года, мы пагаварылі са старшынёй раённага Савета дэпутатаў, членам Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Інэсай БЕЛУШ.**

## Што прываблівае?

У 2016-м Ліда супрацоўнічала з 70 суб'ектамі Расійскай Федэрацыі, што на дзесяць больш, чым у 2015-м. Адкуль столькі новых сувязяў? У раёне сістэмна з 2005 года праводзяцца мерапрыемствы па прыцягненні інвестараў. Спачатку гэта былі выставы «Ліда — рэгіён», дзе дэманстраваліся магчымасці эканомікі раёна. Запрашаліся прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў краіне, дэлегацыі гарадоў-пабрацімаў...

— Калі першапачатковы колькасць гасцей і ўдзельнікаў налічвалася каля сотні, то потым кола ўдзельнікаў вырасла да трохсот прадстаўнікоў з 16 розных краін, — расказвае Інэса Белуш. — У выніку такіх візітаў напрацаваны кантакты і вялікі вопыт. Інвестыцыі ідуць туды, дзе ёсць давер. Пабудаваны прадпрыемствы з замежным капіталам: з амерыкан-



Старшыня раённага Савета дэпутатаў Інэса БЕЛУШ.

скім — «БЕЛТЭКС-ОПТЫК», з нямецкім — «ХАВЕР BY металатканы завод» і іншыя. Практычна штогод у рамках мерапрыемстваў падпісваліся новыя дамовы і пагадненні.

З цягам часу прыйшлі новыя формы пазіцыянавання свайго рэгіёна — форумы. Толькі летась адбыліся два такія мерапрыемствы. Вядзецца работа па арганізацыі аналагічных су-

стрэч у 2017 годзе — такое даручэнне даў старшыня райвыканкама Міхаіл КАРПОВІЧ.

У Лідзе развіваюцца каля дзесяці галін прамысловасці. Арганізацыі раёна заўсёды арыентаваліся на экспарт. Дарэчы, апошняе дзесяцігоддзе ў Лідчыны стабільнае дадатнае сальда знешнеэканамічнага абароту. Прывабным для інвестараў становіцца і тое, што тэрыторыя раёна часткова ўваходзіць у СЭЗ «Гроднаінвест» — гэта дае падатковыя бонусы для вытворчасці. Ліда актыўна прыцягвае турыстаў. Летась у сямі крамах раёна была ўведзена сістэма вяртання падатку на дабаўленую вартасць TAX FREE. А яшчэ былі распрацаваны новыя турыстычныя маршруты, якія прадставілі на XII Міжнародным беларуска-літоўскім эканамічным форуме і Рэспубліканскай універсальнай выставе-кірмашы «Еўрарэгіён «Нёман» —2016».

## Капейка беражэ бюджэт

Кожны год раённы бюджэт удакладняецца ў бок павелічэння. «Мы адзін з некалькіх раёнаў Гродзенскай вобласці, хто выканаў летась бюджэт без усялякіх карэкціровак», — дадае